УДК 329(430)“1990/...”

# РАЗВІЦЦЁ ПРАВАРАДЫКАЛЬНАГА РУХУ ВА УСХОДНЯЙ ГЕРМАНІІ Ў 1990-я – ПАЧАТКУ 2000-х ГАДОЎ

*А.А. РЫБАК*
*(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск)*

*У артыкуле праводзіцца аналіз развіцця праварадыкальнага руху ва ўсходніх землях ФРГ у 1990 – пачатку 2000-х гадоў. Разглядаюцца асаблівасці фарміравання крайне правых структур на тэрыторыі былой ГДР, прычыны роста праварадыкальных настрояў сярод жыхароў Усходняй Германіі, у прыватнасці, крайняга нацыяналізму, расізму, ксенафобіі. Падкрэсліваецца адсутнасць прамой сувязі паміж узроўнем ксенафобіі ў грамадстве і колькасцю іншаземцаў. Прасочваецца станаўленне філіялаў праварадыкальных палітычных партый на ўсходзе аб'яднанай Германіі. Асаблівая ўвага надаецца феномену Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Германіі (НДПГ), адзначаецца яе арыентацыя на выбаршчыка з усходняй часткі краіны. У кантэксце арганізацыйнага развіцця партыі паказана сувязь паміж НДПГ, неанацысцкімі аб'яднаннямі і групіроўкамі правых скінхэдаў, вядучая роля партыі ў выпрацоўцы стратэгічных асноў і каардынацыі іх дзейнасці.*

**Уводзіны.** Паведамленні сродкаў масавай інфармацыі аб поспехах правых радыкалаў у апошнія гады выклікаюць уражанне, што гэтая палітычная тэндэнцыя з'яўляецца выключна ўсходненямецкім феноменам. Аб гэтым сведчаць поспехі праварадыкальных партый на выбарах у парламенты новых земляў. З-за гэтых падзей у аглядальніка фарміруецца ўражанне, што ў другой палове 1990-х гадоў база падтрымкі правых экстрэмістаў змясцілася з захаду на ўсход Германіі. Такога пункту погляду прытрымліваецца і вядомы даследчык правага экстрэмізму Рыхард Штос, заўважаючы, што ўсходнія землі з сярэдзіны 1990-х гадоў сталі асяродкам спантанага, слаба арганізаванага і ідэалагічна неабгрунтаванага, але вельмі агрэсіўнага пратэсту [1, s. 150]. У сваю чаргу Бернд Вагнер характэрызуе ўсходнегерманскі правы радыкалізм 1990-х гадоў як арганізацыйна слабы, але маючы пад сабой вельмі ўрадлівую глебу [2, s. 4]. Партыі і групоўкі праварадыкальнага руху, гледзячы па дынаміцы колькасці іх членаў і выбаршчыкаў, пачалі плённа апрацоўваць гэтую глебу з 1998 года.

Пры даследаванні правага радыкалізму ва Усходняй Германіі неабходна засяродзіцца на розных формах існавання і палях дзейнасці, якія ён прымаў у розных частках краіны, на асаблівасцях развіцця гэтай палітычнай з'явы ў новых федэральных землях. Не можа ігнаравацца і розная эканамічная сітуацыя на ўсходзе і захадзе ФРГ, а таксама гістарычна абумоўленая палітычная культура насельніцтва.

Погляд на суадносіны колькасці беспрацоўных у старых і новых землях пацвярджае важкасць апошніх аспектаў. Адпаведна Федэральнаму ведамству працы, на ліпень 2000 года ў старых землях іх налічвалася 7,5 %, тады як у новых землях колькасць іх дасягала 17 %. Сярод дваццаціпяцігадовых розніца была яшчэ больш значная: на захадзе 7,8 %, а на ўсходзе 18,3 % моладзі не мелі працы. Гэтая з'ява сведчыць пра сувязь паміж беспрацоўем і правым радыкалізмам, але не прэтэндуе на тое, каб стаць яго адзінай прычынай. Лічбы дэманструюць розны памер сацыяльных і эканамічных праблем, якія праз прамы (беспрацоўе, паніжэнне сацыяльнага статуса) або непрамы ўплыў (боязь гэтых змяненняў) ствараюць спрыяльныя ўмовы для правага радыкалізму [3, s. 4].

Яшчэ больш важнай прычынай з'яўляецца палітычная культура як гістарычна ці рэгіянальна абумоўлены комплекс поглядаў, адносін і спосабаў дзеянняў у дачыненні палітычнага жыцця, які характэрны для грамадзян пэўнай краіны. Па сутнасці, у кантэксце правага радыкалізму размова ідзе пра розны памер падтрымкі грамадствам дэмакратычных ці недэмакратычных аксеалагічных установак. У якасці прыклада гэтай сувязі можна прывесці вынікі апытання, праведзенага Інстытутам Форса (Forsa-Institut) у чэрвені 2000 года, пры якім на пытанне: «Ці задаволены вы палітычнай сістэмай Германіі?», 32 % рэспандэнтаў на захадзе і 58 % на ўсходзе адказалі: «не». Гэтыя дадзеныя яскрава ілюструюць наяўнасць большай апазіцыі дэмакратычнаму ладу і прававой дзяржаве на ўсходзе. Такое становішча можа быць растлумачана сацыялізацыяй насельніцтва падчас існавання ГДР [3, s. 4] .

І ў рэшце рэшт, для разумення праблем правага радыкалізму ва Усходняй і Заходняй Германіі неабходна прыняць да ўвагі рознае стаўленне да гэтага палітычнага феномена ў розных рэгіёнах краіны да 1989 года. У Федэратыўнай рэспубліцы праварадыкальныя партыі маглі параўнальна свабодна развівацца, мелі роўныя палітычныя правы з іншымі палітычнымі структурамі. Абмежаванні праяўляліся толькі ў выглядзе асобных забараняючых мерапрыемстваў супраць экстрэмісцкіх арганізацый. З боку дзяржавы сіламі Службы абароны Канстытуцыі (САК) адбываўся маніторынг радыкальнай часткі палі-

тычнага поля. Разам з тым грамадства ФРГ заняло крытычную пазіцыю ў адносінах да правага радыкалізму, што праяўлялася ў форме дэманстрацый, ініцыятыў ці публікацый. У адрозеннні ад ФРГ, у ГДР арганізацыі гэтага палітычнага лагера былі забаронены, як і ўсе іншыя аб'яднанні, якія не былі лаяльнымі рэжыму САПГ. Гэта, аднак, не азначае, што ў ГДР не ўтвараліся нефармальныя крайне правыя арганізацыі ці не было адпаведных палітычна матываваных канфліктаў. Апошнія замоўчваліся дзяржаўным кіраўніцтвам, так як іх проста не павінна было быць у «антыфашысцкай дзяржаве». У выніку гэта прывяло да адсутнасці крытычнай дыскусіі ці, прынамсі, чуйнасці грамадскасці да гэтай тэмы.

**Асноўная частка.** На працягу дзевяностых гадоў XX стагоддзя ніводнай праварадыкальнай партыі не ўдалося атрымаць месцаў у бундэстагу. Поспехам правых экстрэмістаў лічылася любое пераадоленне імі пяціпрацэнтнай мяжы падчас выбараў. Нямецкі народны саюз (ННС) атрымаў у 1991 годзе ў Брэмене 6,2 %, у 1992 у Шлезвіг-Гальштэйне – 6,3 %, у 1998 у Саксоніі-Анхальт – 12,9 %, у 1999 годзе ў Брандэнбургу 5,3 % галасоў. Гэта, аднак, ні ў якім выпадку не з'яўляецца тэндэнцыяй, якая можа азначаць наступныя поспехі ННС на ўсходзе краіны. Так, у 1998 годзе на выбарах у ландтаг зямлі Мекленбург-Пярэдняя Памеранія саюз набраў толькі 2,9 %, а ў 1999 годзе на выбарах у ландтаг Цюрынгіі – 3,1 % галасоў выбаршчыкаў. Для партыі рэспубліканцаў (ПР) рашучым поспехам сталі 10,9 % у 1992 годзе і 9,1 % галасоў выбаршчыкаў у 1996 годзе ў Бадэн-Вюртэмбергу. На ўсіх астатніх выбарах на працягу 1990-х гадоў вынікі азначаных партый, а таксама блізкай да іх Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Германіі змяшчаліся ў межах паміж 2 і 4 % галасоў [1, s. 76].

Аналіз вынікаў выбарчых кампаній сведчыць, што правы радыкалізм да канца 1990-х гадоў меў пераважную падтрымку менавіта ў заходніх рэгіёнах Германіі, і толькі на мяжы стагоддзяў правыя партыі здолелі абазначыць сябе ва ўсходніх землях. Сярод насельніцтва Усходняй Германіі ўзрасла гатоўнасць аддаць свой голас на выбарах праварадыкальным арганізацыям. У гэтым кантэксце легка заўважыць, што ПР свае адносныя поспехі атрымлівала выключна ў «старых» землях, у адрозненні ад ННС, які дасягнуў гучных вынікаў якраз на ўсходзе краіны. Магчыма, гэта тлумачыцца розным палітычным іміджам партый у грамадскай свядомасці. У той час як рэспубліканцы імкнуцца схаваць свае праваэкстрэмісцкія пазіцыі пад маскай сур'ёзнай кансерватыўнай сілы, Нямецкі народны саюз выкарыстоўвае простыя лозунгі, заснаваныя на незадаволенасці існуючым палітычным рэжымам і ксенафобіі. Відавочна, апошняя тактыка ўражвае выбаршчыкаў на ўсходзе больш, чым варыянт ПР. Аднак у цэлым і ПР, і ННС падкрэсліваюць, што з'яўляюцца «вернымі Асноўнаму закону» арганізацыямі [4, s. 1; 5, s. 3].

Пры даследаванні колькаснага складу і арганізацыйнай будовы крайне правых партый неабходна ўяўляць, што ў Заходняй і Усходняй Германіі існавалі розныя ўмовы для стварэння і дзейнасці праварадыкальных аб'яднанняў. У той час як у ФРГ, за выключэннем выпадку з забаронай у 1953 годзе Сацыялістычнай імперскай партыі, структуры гэтага палітычнага лагера маглі развівацца параўнальна вольна, у ГДР сама магчымасць іх існавання адмаўлялася дзяржавай. Пасля адчынення межаў заходнегерманскія праварадыкальныя партыі імкнуліся як мага хутчэй стварыць свае філіялы ў тады яшчэ існаваўшай ГДР. Але іх надзеі на масавы прыток новых прыхільнікаў не спраўдзіліся. Стварэнне зямельных, акруговых і мясцовых аб'яднанняў праходзіла павольна. Да 1999 года з 14000 членаў ПР і 17000 членаў ННС толькі адпаведна каля 10 і 5 % уваходзілі ва ўсходнегерманскія аддзяленні партый. У апошнія гады доля ўсходнегерманскіх членаў партый пастаянна змяншалася. Толькі ў цэлым арганізацыйна слабы ННС меў больш-менш моцныя партыйныя асяродкі, якія разам з тым не пазбеглі ўнутраных канфліктаў. Вынікам іх стаў раскол фракцыі ННС у ландтагу Саксоніі-Анхальт, што значна абмежавала магчымасць яе ўплыву на прыняцце рашэнняў парламента.

Нацыянальна-дэмакратычная партыя Германіі ўяўляе сабой феномен, які супярэчыць агульнаму разуменню становішча праварадыкальнага лагера. Да пачатку 1990-х гадоў партыя знаходзілася ў найбольш глыбокім крызісе за ўсю гісторыю існавання і фактычна распалася. На гэтым фоне ёй яшчэ менш, чым абодвум іншым праварадыкальным партыям, удалося стварыць уласную базу на ўсходзе краіны. Таму ў другой палове 1990-х гадоў перад НДПГ паўстала задача па інтэнсіўным пераадоленні гэтай негатыўнай сітуацыі. Уздым быў цесна звязаны з ідэалагічнымі, арганізацыйнымі і стратэгічнымі змяненнямі. Партыйныя пераўтварэнні прынеслі пэўны плён: калі ў 1996 годзе колькасць членаў партыі не перавышала 3500, у наступныя два гады безупынна расла і ў 1998 годе дасягнула 6000. Аднак у 1999 годзе рост спыніўся. Ідэалагічна партыя прыйшла, з аднаго боку, да вострага вербальнага адмаўлення канстытуцыйна-дэмакратычнага ладу, з іншага – да арыентацыі на «нацыянальны сацыялізм», які спалучае антыкапіталістычныя і народніцкія (völkischen) канцэпцыі [6, s. 10 – 12]. У стратэгічным плане партыя працягвала развіваць свой традыцыйны стыль, які выражаўся ў забеспячэнні любых значных палітычных кампаній актыўнымі вулічнымі акцыямі.

Усе гэтыя змяненні мелі вялізнае значэнне для НДПГ і прыцягнулі ўвагу ўсходнегерманскага пратэстнага электарату. З канца 1990-х гадоў з былой ГДР паходзіла падаўляючая колькасць новых членаў

партыі. У Саксоніі ўтварылася буйнейшая рэгіянальная структура нацыянал-дэмакратаў, з 1200 удзельнікамі далёка апярэдзіўшая ўсе астатнія. Прыток на ўсходзе забяспечылі пераважна маладыя мужчыны, у той час як на захадзе мясцовыя арганізацыі аб'ядноўваюць пераважна састарэлых. Заўважным з'яўляецца той факт, што ў старых землях такая тэндэнцыя была характэрна яшчэ ў другой палове 1980-х гадоў, але з таго часу прыцягальнасць крайне правых сіл для маладых немцаў на захадзе відавочна знізілася [7, s. 127]. Ва ўсходніх федэральных землях падтрымліваецца новая сацыялістычная ідэалагічная лінія, замяніўшая старую прыватнаўласніцкую. Менавіта яўнае і адназначнае адмаўленне капіталізму дазволіла прыцягнуць увагу жыхароў былой ГДР і спалучыць іх з патрабаваннямі нацыянальна-народніцкіх асяродкаў [6, s. 8 – 11]. Такім чынам партыя наблізілася да пэўных крайне правых палітычных плыняў 1920-х гадоў, якія таксама імкнуліся звязаць паняцці «нацыя» і «сацыялізм».

Гэты працэс адчыніў дзверы ў НДПГ і яе моладзевую арганізацыю «Маладыя нацыянал-дэмакраты» многім актывістам неанацысцкіх груповак. Некаторым з іх удалося нават узняцца да высокіх пастоў у партыі, увайсці ў федэральную ўправу, прычым гэтая тэндэнцыя зноў жа характэрна пераважна для філіялаў партыі на ўсходзе. Разам з тым партыя імкнулася інтэграваць у свой склад шматлікіх правых скінхэдаў ці хаця б выкарыстаць іх мабілізацыйны патэнцыял пры правядзенні вулічных маніфестацый. Такія выступленні, сабраўшыя ад 1000 да 5000 чалавек, неаднаразова ўдавалася арганізаваць як на ўсходзе, так і на захадзе Германіі. Пры гэтым кідаюцца ў вочы розныя лозунгі, якія суправаджалі маршы правых экстрэмістаў у розных частках краіны. У той час як на захадзе падставай для пратэсту стала выстава «Знішчальная вайна. Злачынствы вермахта ў 1941 – 1944 гг.», на ўсходзе у цэнтры выступленняў былі сацыяльныя лозунгі «Работа найперш для немцаў», «Супраць еўра і буйнога капіталу», ці «Нашу нямецкую краіну – у рукі рабочых і сялян» [3, s. 6]. Характэрна, што некаторыя дзеячы заходніх суполак НДПГ лічаць гэтыя выступленні шкоднымі для працы на выбарах, так як скінхэды і неанацысты адпужваюць нацыянальна арыентаваных прадстаўнікоў сярэдняга класа [8, s. 12].

Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Германіі ўдалося сабраць на сваіх дэманстрацыях такую колькасць актывістаў, якой не было з пачатку 1970-х гадоў. Аднак падчас выбараў у 1990-я гады партыя не атрымала якіхсьці заўважных поспехаў, вагаючыся ў межах паміж 0,2 і 1 % галасоў выбаршчыкаў. Найбольш моцнае рэгіянальнае партыйнае аб'яднанне ў Саксоніі дасягнула толькі 1,4 % галасоў на выбарах у ландтаг. Пры такіх рэзультатах не было сэнсу разлічваць на абумоўленае заканадаўствам вяртанне дзяржавай перадвыбарных выдаткаў і аблягчэнне фінансавага становішча партыі. Тым не менш стратэгічны курс партыі можна акрэсліць як з'арыентаваны на перспектыву, прычым курс на стварэнне моцнага рэгіянальнага асяродку ў Саксоніі з'яўляецца важнай часткай партыйнага плана. У прыватнасці, на саксонскіх камунальных выбарах 2004 года ў 50 муніцыпалітэтах НДПГ атрымала ад 15 да 23 % галасоў выбаршчыкаў. У тым жа годзе партыя атрымала 12 дэпутацкіх месцаў у ландтагу Саксоніі, набраўшы 9,1 % галасоў [9, s. 54].

Поспехі НДПГ выклікаюць усё большую занепакоенасць, калі ўлічыць праграмныя змяненні партыі. Пераняццё выразных рыс неанацызму стала падставай для шырокай дыскусіі аб неабходнасці забароны НДПГ. У такіх умовах іншыя праварадыкальныя партыі на працягу другой паловы 1990-х гадоў адмаўляліся ад любых сумесных акцый з нацыянал-дэмакратамі, па крайняй меры на федэральным узроўні.

Адзінымі рэальнымі саюзнікамі НДПГ засталіся неанацысцкія аб'яднанні. Зближэнне з імі пачалося з 1996 года, калі партыю ўзначаліў Уда Фойгт [10, s. 24]. Пад неанацысцкімі арганізацыямі разумеюцца аб'яднанні асоб, якія ідэалагічна звязаныя з гістарычным нацыянал-сацыялізмам і існуюць пад рознымі найменнямі з пачатку 1970-х гадоў [11, s. 63 – 64]. Грамадская актыўнасць неанацысцкіх груповак праяўляецца ў правакацыйных маршах і агрэсіўнай прапагандзе, а таксама ў гвалтоўных дзеяннях іх некаторых удзельнікаў. У параўнанні з сярэдзінай 1980-х гадоў плынь губляла ўсё больш прыхільнікаў, у 1989 годзе іх налічвалася 1500 (1987 год – 2100). Як і іншыя прадстаўнікі правага экстрэмізму, неанацысты спадзяваліся папоўніць свае шэрагі пасля аб'яднання Германіі за кошт адэптаў з новых федэральных земляў. Ужо ў 1989 годзе там з'явіліся дробныя нефармальныя неанацысцкія групкі. Сетка такіх карлікавых арганізацый дазволіла неанацыстам замацавацца ва Усходняй Германіі, наступным крокам стала аб'яднанне рэгіянальных структур у межах «Нацыянальнай альтэрнатывы» у 1990 годзе. Практычна адначасова, у 1989 годзе, на захадзе была створана «Нямецкая альтэрнатыва», стаўшая да пачатку 1990-х гадоў буйнейшай неанацысцкай арганізацыяй і налічваўшая ў сваіх шэрагах каля 350 членаў (1992 г.) [1, s. 89 – 92]. Ужо да канца 1990-х мэта па прыцягненню новых удзельнікаў плыні была выканана. У 1999 годзе арганізацыі неанацысцкай плыні налічвалі 2100 прыхільнікаў (у 1991 – 1400), прычым амаль палова з іх прадстаўляла Усходнюю Германію, хаця доля яе насельніцтва складае ўсяго 20 % ад агульнанямецкага.

Паралельна ўтвараліся нефармальныя аб'яднанні гатовых да гвалту правых скінхэдаў, да якіх у 1991 годзе прылічвалі 4200 асоб. Менавіта ва ўсходніх землях абедзве экстрэмісцкія плыні супрацоўні-

чалі найбольш шчыльна, у той час як на захадзе існавалі пэўныя праблемы ва ўзаемаразуменні паміж імі. Да таго ж, з 1992 года пачалася хваля моцнага прэсінгу неанацысцкіх аб'яднанняў з боку дзяржавы. Пад забарону трапілі ўжо ўзгаданыя «Нацыянальная альтэрнатыва» і «Нямецкая альтэрнатыва», Свабодная рабочая партыя, а таксама дзейнічаўшыя ў новых землях «Прамое дзеянне / Сярэдняя Германія» (Direkte Aktion / Mitteldeutschland) і «Нацыянальнае наступленне» (Nationale Offensive) [12, s. 151]. Да забарон неанацысцкіх шэсцяў і іншых мерапрыемстваў дадаліся меры судовага пераследу ў дачыненні актывістаў плыні, у якіх пры вобыску акрамя агітацыйных матэрыялаў былі знойдзены зброя і ваенная амуніцыя. Рашучыя захады дзяржавы прывялі да распаўсюджвання панічных настрояў у неанацысцкім асяроддзі. Арганізацыі, якія яшэ засталіся, практычна страцілі магчымасць эфектыўнай дзейнасці. Паўстала вострая неабходнасць хаця б часовага збліжэння з правымі скінхэдамі. У перспектыве неанацысты адмовіліся ад стварэння аб'ядноўваючай іх дамінуючай арганізацыі, больш спрыяльным стаў варыянт, пры якім функцыянаванне плыні павінна было забяспечвацца шляхам каардынацыі высілкаў аўтаномных структур. З 1994 года па ўсёй краіне была створана сетка часам зусім новых рэгіянальных груповак у выглядзе «нацыянальных таварыстваў» (Nationale Kameradschaften), некаторыя з якіх мелі законспіраваны характар. Толькі за 1998 – 1999 гады іх колькасць узрасла з 80 да 150. Выражаная формулай «Свабодныя нацыяналісты» адсутнасць адзінага цэнтра, не дазваляўшая дзяржаве паралізаваць дзейнасць неанацысцкай плыні адным ударам, стала напачатку даволі значнай перашкодай у вырашэнні ўласных задач крайне правых. У прыватнасці, менавіта няўзгодненасць стала прычынай правалаў шэрагу буйных вулічных акцый, у тым ліку марша памяці Рудольфа Геса ў 1999 годзе. Аднак патэнцыял неанацыстаў быў выкарыстаны НДПГ, якая прыцягвала іх для ўдзелу ва ўласных мерапрыемствах [13]. Нацыянал-дэмакраты не толькі валодаюць інфраструктурай, якая дазваляе выпускаць агітацыйныя матэрыялы ці праводзіць навучанне сваіх прыхільнікаў, але па ініцыятыве старшыні партыі Фойгта, нават абсталявала памяшканні, дзе іншагароднія ўдзельнікі акцый НДПГ размяшчаюцца на час іх правядзення [14, s. 4].

Неанацысты разам з правымі скінхэдамі сталі галоўнымі рэалізатарамі распрацаванай НДПГ канцэпцыі «нацыянальна вызваленых зон» (НВЗ). Тэрмін быў пераняты ў левых лацінаамерыканскіх партызан 1960 – 70-х гадоў, якія разумелі пад ім пэўны рэгіён краіны, дзе ўлада існаваўшага аўтарытарнага рэжыму была заменена пастаянным дамінаваннем рэвалюцыйных сіл. Для выкарыстання ў фармальна блізкім сэнсе ў рамках новай палітычнай платформы тэрмін быў прапанаваны ў 1991 годзе «Нацыянал-дэмакратычным саюзам вышэйшай школы», структурнай адзінкай НДПГ [8, s. 20 – 22]. Згодна ёй, правыя экстрэмісты павінны імкнуцца не толькі пераняць функцыі органаў дзяржаўнай улады, але і дасягнуць той ступені грамадскай гегемоніі, якая дазволіла б ім легалізаваць свае палітычныя мэты ў вачах мясцовага насельніцтва [8, s. 20].

У пачатку 1990-х гадоў не існавала ўмоў для хаця б частковай рэалізацыі канцэпцыі НВЗ. Аднак з павелічэннем патэнцыялу руху скінхэдаў і, што немалаважна, пачаткам супрацоўніцтва паміж ім і НДПГ, а таксама неанацысцкімі актывістамі ў шэрагу мясцовасцей, галоўным чынам на ўсходзе Германіі, праваэкстрэмісты здолелі, відавочна, узмацніць свае пазіцыі. Абраўшы сваёй першаснай мэтай «авалоданне вуліцай», яны сталі неад'емнай часткай паўсядзённага жыцця многіх дробных усходнегерманскіх гарадкоў. Агрэсіўна настроеныя правыя збіраюцца звычайна ўвечары ля грамадскіх месцаў і імкнуцца стварыць атмасферу напружанасці, чаму спрыяюць гвалтоўныя дзеянні ў адносінах да «чужынцаў» і асоб, якіх прылічваюць да левых [15, s. 18]. На думку шматгадовага даследчыка ўсходнегерманскага правага экстрэмізму Бернда Вагнера, у невялікіх мясцовасцях кшталту Малоў (Mahlow) у Брандэнбургу ці Мульдэнштайн (Muldenstein) у Саксоніі-Анхальт для таго, каб кантраляваць вакзалы, дыскатэкі ці запраўчныя станцыі, хапае, як правіла, групы з 30 – 40 чалавек [3, s. 10]. У буйных гарадах захады неанацыстаў сутыкаюцца з процідзеяннем левардыкальных «антыфашысцкіх груп», што на перыферыі практычна немагчыма [16, s. 544 – 545].

Нацыянальна вызваленыя зоны, якія старшыня бундэстага Вольфганг Тырзэ назваў не інакш, як «зонамі страху», з'яўляюцца на сённяшні момант характэрнай рысай жыцця ўсходнегерманскай правінцыі [15, s. 18]. Перамога ў «бітве за вуліцу» дае магчымасць правым экстрэмістам стварыць і падчас выбарчай кампаніі атмасферу ціску ў адносінах да палітычных праціўнікаў. Дзяржаўныя мерапрыемствы кшалту саксонскага Закона аб абароне грамадзянскіх свабод ад гвалту і яго пагрозы падчас выбараў, мяркуючы па апошніх выніках крайне правых у гэтай федэральнай зямлі, працуюць у недастатковай ступені [17, s. 1]. Захады па забароне Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Германіі як пагражаючай існаванню свабодна-дэмакратычнага ладу ў ФРГ таксама не мелі плёну [18, s. 1].

**Заключэнне.** На працягу 1990-х гадоў поўнага перамяшчэння ўсіх асяродкаў і сфер дзейнасці правых сіл у новыя федэральныя землі не адбылося. Да сённяшняга часу існуюць выразныя рэгіянальныя адрозненні, якія фарміруюць агульную карціну дзейнасці праварадыкальных арганізацый. Захад застаецца тэарэтыка-ідэалагічным цэнтрам нямецкіх крайне правых. Ва Усходняй Германіі большую падтрымку

знаходзяць агрэсіўныя лозунгі, вулічныя акцыі і гвалтоўныя дзеянні, што пацвярджаецца значна большай доляй фактаў ПМЗ, актывізацыяй груп скінхэдаў і неанацыстаў. Такая спецыялізацыя руху абумоўліваецца і тым, што сярэдні ўзрост удзельнікаў праварадыкальнага руху на ўсходзе значна ніжэйшы.

Існуе верагоднасць, што ў бліжэйшы час усход Германіі стане носьбітам асноўнага праварадыкальнага патэнцыялу. Яшчэ ў першай палове 1990-х гадоў імавернасць поспеху крайне правых якраз сярод насельніцтва старых земляў была большай. У 1994 годзе погляды правых радыкалаў безумоўна падзялялі 5,5 % насельніцтва Заходняй Германіі і 3,7 % насельніцтва Усходняй Германіі. З асобнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі праварадыкальнага руху пагаджаліся 19,3 % жыхароў старых земляў і толькі 9,3 % – былой ГДР [3, s. 13]. Але ўжо да 1998 года, згодна звесткам Оскара Нідэрмайера і Рыхарда Штоса, становішча карэнным чынам змянілася: ва ўсходніх землях лозунгі правых экстрэмістаў прываблівалі 17 % насельніцтва, у той час як у заходніх – 12 % [1, s. 29]. Што схільны тлумачыць гэты факт расчараваннем усходніх немцаў у дэмакратычнай сістэме і рынкавай эканоміцы, выкліканым адаптацыйнымі цяжкасцямі. Рост праварадыкальнага патэнцыялу на ўсходзе Германіі адбываецца за кошт маладых людзей, якія не маюць настальгічных пачуццяў, і ў гэтым яго перспектыва і небяспека.

ЛІТАРАТУРА


1. Stöss, R. Rechtsextremismus im vereinten Deutschland / R. Stöss. – Erkrath: Toennes Satz + Druck GmbH, 2000. – 189 s.
2. Wagner, B. Rechtsextremismus und kulturelle Subversion in den neuen Ländern / B. Wagner // Deutsche Lehrzeitung spezial. – 1998. – № 19.
3. Pfahl-Traughber, A. Die Entwicklung der Rechtsextremismus in Ost- und Westdeutschland / A. Pfahl-Traughber // Aus Politik und Zeitgeschichte. – 2000. – B39.
4. REP-Parteiprogramm 1994. – Bonn: Eigendruck, 1994. – 63 s.
5. DVU-Parteiprogramm. – München: DSZ-Verlag, 2005. – 6 s.
6. NPD-Parteiprogramm 1997. – Berlin: Eigendruck, 2004. – 20 s.
7. Jaschke, H-G. Die «Republikaner». Profile einer rechtsradikalen Partei / H-G. Jaschke. – Bonn: Funke, 1993. – 250 s.
8. Brodkorb, M. Metamorphosen von Rechts / M. Brodkorb. – Rostok: Altstadtdruck GmbH, 2002. – 113 s.
9. Kailitz, S. Rechtsextremismus in der Bundesrepublik Deutschland. Auf dem Weg zur «Volksfront»? / S. Kailitz // Zukunftsforum Politik. – 2005. – № 65. – 90 s.
10. Skinheads und Rechtsextremismus. Instrumentalisierung einer jugendlichen Subkultur. – Geldern: Druckerei JVA Geldern, 2001. – 145 s.
11. Dudek, P. Entstehung und Entwicklung des Rechtsextremismus in der Bundesrepublik. Band I. Zur Tradition einer besonderen politischen Kultur / P. Dudek, H-G. Jaschke. – Opladen: Müller Verlag, 1984. – 374 s.
12. Seelig, M. Ursachen für Rechtsextremismus und Fremdfeindlichkeit / M. Seelig // Für eine tolerante Gesellschaft – gegen Rechtsextremismus und Rassismus. Internationale Berliner Konferenz; Hrsg. P. Pau, D. Heilig. – Berlin: Karl Dietz Verlag Berlin, 2001. – 176 s.
13. Erklärung des Bundesministers des Innern Otto Schily anlässlich der Vorlage des Verfassungsschutzberichtes 1998 am 25. März 1999 // Bulletin 2002. Bulletin 1996 – 2001 [Электронны рэсурс] / Presse- und Informationsamt der Bundesregierung – 2003. – 1CD-ROM.
14. Ramelsberger, A. Erkundungen in Ostdeutschland / A. Ramelsberger // Aus Politik und Zeitgeschichte. Rechtsextremismus. – 17 Oktober 2005. – № 42.
15. Rechtsextremismus in Deutschland. Eine Handreichung / SPD-Bundestagsfraktion. – Berlin: Eigendruck, 2005. – 78 s.
16. Mletzko, M. Gewaltdiskurse und Gewalthandeln militanter Szene. Teil 1 / M. Mletzko // Kriminalistik. – 2001. – № 8 – 9.
17. ZWD. Bildung-Wissenschaft-Kulturpolitik. – 2000. – 15 J-g. – № 13 – 14&15.
18. Das Parlament. – 24 – 31 März 2003. – № 13 – 14.


*Паступіў 05.06.2007*